# Янка Купала
# Лирыка

Выканавал:
Вучаник 9 «В» класса
Кавалёв Микита

# Лирыка

- Патрыятычная тэматыка ў творчасці Я. Купалы займае галоўнае месца. Лепшыя вершы дарэвалюцыйнага часу і творы, напісаныя ў савецкі час, прысвечаны радзіме і родным мясцінам, гісторыі і сучаснасці. Яны паэтызуюць прыгажосць прыроды, годнасць і духоўнае багацце чалавека працы.
- Праўда, эмацыянальны лад патрыятычнай лірыкі савецкага часу значна адрозніваецца ад вершаў дарэвалюцыйных. У паслякастрычніцкі перыяд у вершах паэта пераважае настрой бадзёрасці, аптымізму, жыццясцвярджальнага пачатку. Верш «Світае» найбольш яскрава выражае змены ў жыцці народа:
- Эй, годзе ўжо спаць! Уставайце!<br>Глядзіце — світаць пачало.
- Ствараецца ўражанне, быццам верш прасякнуты сонечнымі промнямі.



# Лирыка

- У вершы «У вырай» паэт звяртаецца да вольных птахаў, сакалят з заклікам смела адпраўляцца ў выран, узнёсшыся да неба, да зорак, да касмічных вышынь. У першым радку метафарычнасць вобраза птушак не раскрываецца, але ўзнёслая танальнасць і заклік пазнаваць свет даюць зразумець, што існуе яшчэ адзін сэнсавы план. У другім радку аўтар звяртаецца да птушак, называючы іх нашчадкамі крывічоў — старажытных продкаў беларусаў, і ў чытача ўжо няма сумнення, што ў вобразе вольных птахаў — метафарычнае ўвасабленне беларускага народа. Паэт заклікае народ «вылецець к славе з пагібельнай плесні і песняй агністай дзівіді народы*, гэта значыць адмовіцца ад змрочнага мінулага і смела імкнуцца насустрач усяму новаму, сучаснаму, прагрэсіўнаму, што нясе новы час.
- Аднак пазней Купала стаў заўважаць у новым жыцці і многія адмоўныя з'явы. З болем рэагаваў паэт на русіфікацыю, навязаную Масквой, на прынцып пралетарскага інтэрнацыяналізму.
- З горкай іроніяй піша Купала аб вымушаным адмаўленні ад роднай культуры, аб адарванасці ад нацыянальных гістарычных каранёў.
- О так! Я — пралетар!.. Яшчэ ўчора раб пакутны — Сягоння я зямлі ўладар І над царамі цар магутны!



# Лирыка

- Інтэнсіўнае прымяненне гратэску ў першым слупку падкрэслівае пачуццё горычы і болю, што ахапілі паэта ад усведамлення дзяржаўнай ідэалогіі бездухоўнасці. Мастацкі прыём гіпербалы ў двух апошніх радках сведчыць аб крытычным успрыняцці паэтам палітычных догм савецкай улады.
- Купала не крывіць душой, а творча адлюстроўвае жыццё ва ўсёй складанасці і супярэчлівасці. Аўтар паважае свой талент і свайго чытача. Ён праўдзіва выражае свае думкі і пачуцці, нават калі яны не супадаюць з афіцыйнымі поглядамі, застаецца верным праўдзе жыцця.

